# УДАСКАНАЛЕННЕ ЮРЫДЫЧНАЙ ТЭХНІКІ

***М. Д. Шапялевіч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Заканадаўства любой дзяржавы, у тым ліку і Беларусі, увесь час знаходзіцца ў стане дынамікі. Таму задачай паўнамоцных дзяржаўных органаў з'яўляецца падтрыманне пэўнага ўзроўню якасці нарматыўнага масіва як з пазіцыі яго зместу, так і формы. Пытанне формы галоўным чынам адносіцца да сферы юрыдычнай тэхнікі, што абумоўлівае важнасць гэтай сферы навуковых ведаў.

У наш час пытанні юрыдычнай тэхнікі часткова ўрэгуляваны на заканадаўчым узроўні. Так, Закон Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь» замацаваў агульныя палажэнні, якія былі раскрыты і развіты ў Правілах падрыхтоўкі праектаў нарматыўных прававых актаў, зацверджаных Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 жніўня 2003 г. № 359. Тым не менш наяўнасць даволі шырокага нарматыўнага рэгулявання не вырашае ўсіх пытанняў.

У беларускім заканадаўстве невырашанай застаецца праблема множнага выкарыстання спасылкавых норм. Найбольш часта яно сустракаецца пры ўсталяванні адказнасці, пэўнага адміністрацыйнага парадку ці, што найбольш «небяспечна» для праваўжывальніка, выключэнняў з агульнага правіла. Такая юрыдыкатэхнічная практыка значна ўскладняе праваўжыванне. Зразумела, што спасылкавыя нормы ствараюць сістэмнасць заканадаўства, але гэта немагчыма, калі спасылкі безадрасныя. Гэтую праблему магчыма вырашыць з дапамогай так званага «пакетнага» метада праватворчасці, калі адначасова падрыхтоўваюцца і ўступаюць у сілу базавы акт (часцей за ўсе закон) і падзаконныя акты, якія развіваюць яго палажэнні.

Таксама праблемай з'яўляецца вызначэнне моманту ўступлення нарматыўных актаў у сілу. Закон «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь» усталёўвае розныя тэрміны ў залежнасці ад віду акта. У выпадку, калі нормы акта датычацца правоў ці абавязкаў грамадзян, уступленне ў сілу магчыма толькі пасля афіцыйнага апублікавання. Лічым, што для гэтай катэгорыі актаў неабходна замацаваць

мінімальны тэрмін, магчыма, як і ў выпадку з законам і дэкрэтам – 10 дзён, бо часам указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь усталёўваюць не менш важныя правілы, асабліва для фізічных асоб, чым законы і дэкрэты.

З увядзеннем у дзеянне новага Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчага кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь, на наш погляд, яшчэ больш абвастрылася праблема адсутнасці аднастайнасці нумарацыі структурных элементаў нарматыўных прававых актаў. У вышэйназваных кодэксах заканадаўца адыйшоў ад звыклай сістэмы паслядоўнай нумарацыі артыкулаў і выкарыстаў іншы метад з прывязкай да нумароў глаў. Магчыма ў такой нумарацыі ёсць і станоўчыя рысы, але заканадаўства павінна быць сістэмна пабудавана, а такая разнастайнасць не спрыяе сістэмнасці. Гэта праблема таксама датычыцца вызначэння структурных элементаў артыкулаў: пунктаў і частак. Грамадзянскі і Крымінальны кодэксы дыяметральна процілегла падыходзяць да гэтага пытання, што, на наш погляд, недапушчальна. Няўдала ў гэтым сэнсе праблема вырашана ў Гаспадарчым працэсуальным кодэксе, дзе структурныя элементы ў артыкулах увогуле ніяк не пранумараваны, што значна зніжае хуткаць і зручнаць карыстання.

Такім чынам, у Рэспубліцы Беларусь значная ўвага надаецца праблеме ўдасканалення юрыдычнай тэхнікі. Прававымі актамі на ўзроўні заканадаўчых актаў усталяваны некаторыя правілы, якімі неабходна кіравацца пры падрыхтоўцы праектаў нарматыўных актаў. Але, нягледзячы на гэта, застаюцца некаторыя праблемныя моманты. Яны ўрэгуляваны няпоўна ці нерацыянальна, або прававое рэгуляванне адсутнічае наогул. Сярод найбольш актульных праблем, на наш погляд, неабходна вылучыць наступныя: спасылковасць заканадаўства, тэхніка ўвядзення акта ў дзеянне, момант уступлення ў сілу, праблемы славеснадакументальнага выкладу тэкста акта (нумарацыя артыкулаў, частак, пунктаў) і гэты пералік не завершаны.